АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ БЕЛАРУСКАЯ

ГА «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»

WWW.BAJ.BY

# СМІ Ў БЕЛАРУСІ

ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ

КРАСАВІК–ЧЭРВЕНЬ 2015



Фота: Зміцер Ягораў

*Улады павінны спыніць застасоўванне абмежавальных захадаў у дачыненні да фрыланс-журналістаў і перастаць перашкаджаць ім спакойна і свабодна выконваць сваю працу.*

*Дуня Міятавіч,*
*прадстаўнік АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ*

*Еўрапейская федэрацыя журналістаў (ЕФЖ) надзвычай заклапочаная з прычыны павелічэння колькасці штрафаў, што накладаюцца на журналістаў-фрылансераў за “незаконны выраб прадукцыі СМІ” з красавіка 2014 г..*



# ЗМЕСТ:

**Становішча ў галіне СМІ ў красавіку–чэрвені 2015 г. (агляд) . . . . . . . . . . . 4**

**Асноўныя падзеі ў галіне СМІ ў красавіку–чэрвені 2015 г. . . . . . . . . . . . . . . . . 4**

**Рэйтынгі, індэксы, статыстыка . . . . . . . . . . . . . . 9**

# СТАНОВІШЧА Ў СФЕРЫ СМІ Ў КРАСАВІКУ–ЧЭРВЕНІ 2015 ГОДА (АГЛЯД)

Асноўнымі праблемамі ў галіне СМІ ў красавіку – чэрвені 2015 г. сталіся:

- **узмацненне судовага пераследу журналістаў, чые матэрыялы з'явіліся ў замежных медыях;**
- **увядзенне дзяржаўнай рэгістрацыі распаўсюднікаў прадукцыі СМІ;**
- **актыўнае ўмяшальніцтва Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь у дзейнасць інтэрнэт-рэсурсаў.**

Павелічэнне ціску на журналістаў і медыя-рэсурсы, а таксама ўзяцце пад кантроль сферы распаўсюду прадукцыі СМІ адбываюцца напярэдадні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прызначаных на 11 кастрычніка 2015 г.

# АСНОЎНЫЯ ПАДЗЕІ Ў СФЕРЫ СМІ Ў КРАСАВІКУ–ЧЭРВЕНІ 2015 Г.

## УЗМАЦНЕННЕ СУДОВАГА ПЕРАСЛЕДУ ЖУРНАЛІСТАЎ ЗА СУПРАЦОЎНІЦТВА З ЗАМЕЖНЫМІ СМІ

У другім квартале 2015 г. узмацніўся судовы пераслед беларускіх журналістаў-фрылансераў, чые матэрыялы з'яўляліся ў замежных СМІ, паводле абвінавачання ў прафесійнай дзейнасці журналіста замежнага СМІ без акрэдытацыі.

Калі на працягу першага квартала года былі аштрафаваныя пяцёра журналістаў, то за другі – ужо шаснаццаць, прытым васьмёра з іх – у чэрвені.

Усе яны былі аштрафаваныя на сумы ад 20 да 50 базавых велічыняў (адна базавая велічыня складае 180 тысячаў беларускіх рублёў, што трохі больш за 10 еўра ў эквіваленце). Як і раней, падставай для застасавання да журналістаў санкцыі ч.2 арт. 22.9 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях быў не змест іх матэрыялаў, а сам факт іх з'яўлення ў замежных СМІ. Агульная сума штрафаў, прысуджаных журналістам у першым паўгоддзі 2015 г., склала больш як 108 мільёнаў беларускіх рублёў (звыш 6300 еўра).



**На думку ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў", частка 2 арт.22.9 КаАП, якая выкарыстоўваецца супраць журналістаў, не прадугледжвае адказнасці за журналісцкую дзейнасць без акрэдытацыі. Яна вызначае пакаранне за парушэнне парадку вырабу і распаўсюду прадукцыі СМІ. Аднак журналісты не з'яўляюцца суб'ектамі гэтага правапарушэння, бо яны не вырабляюць прадукцыю СМІ (гэта робіць рэдакцыя СМІ),а таксама не распаўсюджваюць яе. Адпаведна, яны не могуць прыцягвацца да адказнасці за парушэнне парадку ажыццяўлення гэтай дзейнасці.**

Больш за тое, прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці журналістаў, чые матэрыялы з'яўляюцца ў замежных медыях, парушае канстытуцыйнае права грамадзянаў на атрыманне і распаўсюд інфармацыі, а таксама нормы арт.10 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах пра дапушчальнасць абмежавання свабоды выказвання меркавання.

## УВЯДЗЕННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ РЭГІСТРАЦЫІ РАСПАЎСЮДНІКАЎ ПРАДУКЦЫІ СМІ

17 красавіка Міністэрства інфармацыі Беларусі прыняло пастанову №3 “Аб некаторых пытаннях дзяржаўнага рэгулявання дзейнасці распаўсюднікаў прадукцыі друкаваных, тэлевізійных і радыёвяшчальных сродкаў масавай інфармацыі”.

Пастанова рэгулюе парадак рэгістрацыі распаўсюднікаў СМІ, прадугледжаны папраўкамі ў закон “Аб сродках масавай інфармацыі”, унесеных у яго напрыканцы мінулага года. Усе распаўсюднікі прадукцыі СМІ (акрамя рэдакцыяў СМІ) абавязаныя да 1 ліпеня 2015 г. накіраваць у Міністэрства інфармацыі звесткі, якія з’яўляюцца неабходнымі для іх уключэння ў адпаведны Дзяржаўны рэестр. Далейшая дзейнасць без уключэння ў рэестр будзе лічыцца незаконнай. Міністэрства інфармацыі атрымала магчымасці застасоўваць у дачыненні да распаўсюднікаў СМІ санкцыі аж да забароны іх дзейнасці. Пры гэтым распаўсюднікаў пад пагрозай гэтых санкцыяў фактычна прымушаюць адсочваць кантэнт медыяў, што можа стацца схаванай формай цэнзуры.




Па-за законам апынаюцца грамадскія распаўсюднікі СМІ і грамадзяне, якія распаўсюджваюць друкаваныя СМІ на некамерцыйнай аснове (у тым ліку тыя, што яны выпускаюць самі). Існуе пагроза, што іх будуць прыцягваць да адказнасці на падставе ч.2 арт.22.9 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях за парушэнне парадку распаўсюду прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі, асабліва падчас выбарчай кампаніі. Варта заўважыць, што падобная практыка мела месца раней, прычым у дачыненні да распаўсюднікаў як прадукцыі СМІ, гэтак і ўлётак ды іншых неперыядычных выданняў, якія да СМІ не адносяцца.

## УМЯШАЛЬНІЦТВА МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ Ў ДЗЕЙНАСЦЬ ІНТЭРНЭТ-САЙТАЎ

У першай палове траўня 2015 г. Міністэрства інфармацыі накіравала ў рэдакцыі некалькіх сайтаў афіцыйныя лісты за подпісам міністра інфармацыі Ліліі Ананіч. У лістах міністэрства папярэджвала пра свае паўнамоцтвы па застасоўванні ў дачыненні да ўладальнікаў сайтаў санкцыяў (у тым ліку вынясенне папярэджанняў і абмежаванне доступу да сайту) і “даводзіла да ведама”, што на адпаведных інфармацыйных рэсурсах “выяўленыя факты парушэння заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб сродках масавай інфармацыі”. У сувязі з гэтым міністэрства прапаноўвала надаць звесткі пра ўладальнікаў сайту.


МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
пр-т Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск
тэл./факс +375 17 203 92 31, +375 17 203 34 35
e-mail:info@mininform.gov.by

МИНИСТЕРСТВО ... РЕСПУБЛИКИ ...
пр-т Победителей, 11 ...
тел./факс +375 17 203 9...
e-mail:info@mi...

«15» 05 2015 № 02-01-06/485
на № ...

Владельцу инфор...
ресурса www.rac...

О соблюдении законодательства о средствах массовой информации

Информируем, что в соответствии с подпунктом ... 49 Закона Республики Беларусь «О средствах масс... (далее – Закон о СМИ) владельцу информационного ... письменное предупреждение за распростране... информации, которая может причинить вред го... общественным интересам. Кроме того, согласно ... Закона о СМИ по решению Министерства инф... Беларусь осуществляется ограничение доступа ... массовой информации, распространяемой посредст... ресурса, размещенного в глобальной компьютер... случае:

- вынесения владельцу информационного р... двух и более письменных предупреждений;
- невыполнения владельцем информацион... требования государственного органа об ... законодательства Республики Беларусь о ... информации;

Падобныя лісты з Мінінфарма атрымалі сайт “Свабодны рэгіён”, “Беларускае Радыё Рацыя” (Польшча), рэдакцыя музычнага парталу “Тузін Гітоў” , сайт прыхільнікаў Аб’яднанай грамадзянскай партыі ды інтэрнэт-часопіс куку.org. Якія менавіта матэрыялы, на думку міністэрства, парушаюць беларускае заканадаўства, у лістах не паведамлялася.

18 чэрвеня Мінінфарм прыняў рашэнне пра абмежаванне доступу да сайту куку.org. Як адзначалася ў паведамленні гэтага ведамства, у шэрагу публікацыяў сеткавага выдання “утрымліваюцца прыніжальныя выказванні адносна дзяржаўнага свята Рэспублікі Беларусь – Дня Перамогі, грамадзянаў краіны, якія бралі ў ім удзел, аспрэчваецца значнасць дадзенай падзеі ў гісторыі дзяржавы, такім чынам скажаецца гістарычная праўда аб Вялікай Айчыннай вайне”. Больш за тое, міністэрства паведамляла, што ў матэрыялах на сайце прысутнічае “табуяваная лексіка, грэблівыя, а часам і абразлівыя выказванні ў адрас прадстаўнікоў пэўных сацыяльных групаў, нацыянальнасцяў і рэлігійных канфесіяў”.

Падставай для блакавання інфармацыйнага рэсурсу стаўся ліст у міністэрства ад беларускага грамадзяніна, які пражывае за мяжой. Ніякіх папярэджанняў і прадпісанняў рэдакцыя куку.org не атрымлівала.

Доступ да сайту быў адноўлены праз 6 дзён – пасля сустрэчы кіраўніцтва рэдакцыі kyky.org з прадстаўнікамі Міністэрства інфармацыі, у тым ліку з першым намеснікам міністра Ігарам Луцкім, і пасля таго як рэдакцыя прыбрала матэрыялы, якія выклікалі нараканні з боку міністэрства.

У сярэдзіне чэрвеня стала вядома пра блакіроўку і наступнае аднаўленне доступу яшчэ да аднаго сайту – hata.by (рэсурс па продажы і арэндзе нерухомасці).

24 чэрвеня Міністэрства інфармацыі заблакавала доступ да сайтаў bizator.by, ekomok.by, ilotok.by, localmart.by, slanet.by, якія, паводле словаў міністра Л.Ананіч, выкарыстоўвалі свае пляцоўкі “для нядобрасумленнай рэкламы лекавых сродкаў”.

Усяго, паводле інфармацыі Мінінфарма, на працягу першага паўгоддзя міністэрства абмяжоўвала доступ да 26 сайтаў, большасць з якіх займалася распаўсюдам наркотыкаў або змяшчала матэрыялы з табуяванай лексікай. Як зазначалася вышэй, доступ з цягам часу быў адноўлены да двух сайтаў пасля таго, як іх рэдакцыі прынялі меры па “выпраўленні дапушчаных парушэнняў”.

**Права блакаваць доступ да анлайн-рэсурсаў (у тым ліку замежных) у пазасудовым парадку Міністэрства інфармацыі атрымала 1 студзеня 2015 г. пасля ўступлення ў моц паправак у закон “Аб сродках масавай інфармацыі”, унесеных у снежні 2014 г.**



# РЭЙТЫНГІ, ІНДЭКСЫ, СТАТЫСТЫКА

У чарговым “Індэксе свабоды прэсы”, які складае штогод праваабарончая арганізацыя “Рэпарцёры без межаў”, Беларусь засталася на мінулагоднім 157-м месце з 180 магчымых. Гэтую пазіцыю краіна займае з 2012 года.

Найбліжэйшыя краіны-суседкі Беларусі занялі ў рэйтынгу наступныя пазіцыі: Польшча – 18 месца (летась – 19 месца), Літва – 31 месца (у мінулым годзе – 32 месца), Латвія – 28 месца (год таму – 37 месца), Украіна – 129 месца (год таму – 127 месца), Расія – 152 месца (летась – 148 месца).

2 чэрвеня дэлегаты Штогадовага сходу Еўрапейскай федэрацыі журналістаў адзінагалосна падтрымалі заяву ў абарону беларускіх фрылансераў.

Арганізацыя заклікала беларускія ўлады неадкладна спыніць ціск на журналістаў-фрылансераў, якія супрацоўнічаюць з замежнымі СМІ, і адмовіцца ад практыкі іх прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці.

Акрамы гэтага, ЕФЖ заклікала інстытуцыі Рады Еўропы, АБСЕ і ЕС звярнуць увагу на парушэнні свабоды слова ў Беларусі, звязаныя з дзейнасцю журналістаў-фрылансераў, і прадпрыняць крокі для выпраўлення становішча.

ГА «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»

WWW.BAJ.BY

Змест гэтага электроннага выдання абаронены нормамі Аўтарскага права.
Спасылка на ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» пры выкарыстанні матэрыялаў ЭЛЕКТРОННАГА БЮЛЕТЭНЯ «СМІ Ў БЕЛАРУСІ» з'яўляецца абавязковай.
Выдавец: ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (ГА «БАЖ »).
Вул. Камсамольская 7-32, 220030 Мінск, БЕЛАРУСЬ
Тэлефоны: +375 17 203-63-66, 226-70-98 Факс: +375 17 203-63-66, 226-70-98
E-mail: press@baj.by Web: www.baj.by
Кантакт: Бастунец Андрэй Леанідавіч, старшыня ГА «БАЖ »